который наверняка привлечёт к себе внимание покупателя; 2) игровые приёмы придают оригинальность рекламе; 3) «двойное дно» рекламы усиливает запоминаемость текста; 4) полисемия способствует экономии времени, затраченного на создание и восприятие рекламного текста.

**Заключение.** Современная реклама многофункциональна. Если изначально реклама выполняла две основные функции — экономическую (развитие процесса продаж) и информационную (сообщение о наличии товаров и услуг), то сегодня она выполняет и образовательную, и идеологическую, и социально-культурную, а также коммуникативную функции. Реклама имеет различные формы, цели и характеристики. Этим определяется дизайн и лексико-грамматический строй рекламного текста. Так, коммерческая реклама направлена на информирование покупателей о товаре или услуге и на получение прибыли от продажи. Социальная же реклама ставит своей целью создать необходимое общественное мнение по той или иной морально-нравственной проблеме. Как следствие, текст социальной рекламы по структуре сложнее текста коммерческой рекламы.

УДК 821.161.09

**Т. М. Пятроўская**
*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны педагагічны каледж імя Л. С. Выгоцкага», Гомель*

## ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ СУЧАСНАЙ ПАДЛЕТКАВАЙ ПРОЗЫ

**Уводзіны.** Псіхолагі, апісваючы кожны ўзрост, звычайна вылучаюць новаўтварэнне пэўнага перыяду жыцця. У падлеткавым узросце такіх новаўтварэнняў — максімальная колькасць, а значыць, і літаратура для падлетка павінна адпавядаць тым маштабным зменам, якія адбываюцца ў яго псіхіцы. Псіхалагічныя асаблівасці ўзросту вызначаюць кагнітыўныя, паводніцкія і эмацыянальныя аспекты дадзенай літаратуры. З кагнітыўнага боку для падлеткавай літаратуры характэрны наступныя асаблівасці сюжэта: праблемны характар літаратуры, зварот да адносін з прадстаўніком супрацьлеглага полу, наяўнасць атрыбутыкі сучаснага падлеткавага жыцця.

Паводніцкая лінія падлеткавых твораў характарызуецца наступным чынам:

– *героем твораў з'яўляецца падлетак.* Прычым узрост героя, як правіла, і вызначае ўзрост чытацкай аўдыторыі кніг. Так, кніга «Тры талеры» А. Федарэнкі, безумоўна, будзе цікавіць пяцікласнікаў, таму што асноўнымі яе героямі з'яўляюцца падлеткі адпаведнага ўзросту. Такая ж заканамернасць і з творам «Адзінокі васьмікласнік жадае пазнаёміцца» А. Бадака. Менавіта таму аўтары яшчэ ў пачатку твора вызначаюць узроставую прыналежнасць сваіх герояў;

– *адсутнасць станоўчых ці адмоўных персанажаў.* Як правіла, героі адрозніваюцца неадназначнымі паводзінамі, памыляюцца ў сваіх першапачатковых меркаваннях. Увесь сюжэт скіраваны на тое, каб герой на вопыце сваёй уласнай памылкі адкрыў для сябе нешта новае, часам таксама няпэўнае.

**Асноўная частка.** Нягледзячы на ўсю сваю спецыфічнасць, у жанрава-тэматычных адносінах падлеткавая літаратура апошніх пятнаццаці гадоў дастаткова рознабаковая і неаднастайная. З пункту гледжання выхаваўчых і пазнаваўчых задач, якія выконвае дадзеная літаратура, падлеткавую прозу можна падзяліць на пэўныя групы.

1. *Твор-актуалізацыя гістарычнага мінулага.* Сучасных падлеткаў не цікавіць гісторыя. Аднак прыцягальнай для іх з'яўляецца магчымасць перамяшчацца ў розным часе. Фантастычныя часавыя перамяшчэнні становяцца сюжэтастваральнымі элементамі твораў «Казімір — сын Ягайлы + Насця з 8 "Б"», «Памёр, каб нарадзіцца» Р. Баравіковай, «Пакланюся Перуну, памалюся Вялесу» А. Наварыча, «Час заўсёды добры» А. Жвалеўскага і Я. Пастарнак. Усе кнігі звяртаюцца да рознага часавага прамежку, сродкі спосабу актуалізацыі мінулага таксама розныя. Так, гераіня твора «Казімір — сын Ягайлы + Насця з 8 "Б"» Наста становіцца ўдзельніцай вандровак па часавым калідоры фантастычных істот Інф-1 і Інф-2. Верагоднасць усім падзеям надае эпіграф у выглядзе слоў фізіка-оптыка А. Кузаўкіна: «Сыходзячы з тэорыі адноснасці, можна "прабіць тунэлем" і нашу чатырохмерную прастору, выходзячы ў нейкае невядомае нам яшчэ вымярэнне, на іншыя старонкі "кнігі" прыроды» [1, с. 3]. Інфы будуюць своеасаблівы калідор паміж Настай і яе далёкімі продкамі, а менавіта яе бабуляй, якая выратавала ад смерці Казіміра, польскага караля. Усе гістарычныя падзеі Наста бачыць праз сны, яна не ведае пра наяўнасць Інфаў. Аднак у выніку яна з'яўляецца тым самым голасам, які папярэджвае Настусю аб неабходнасці выратаваць шаснаццацігадовага караля. Усё, што адбываецца з Настай, здаецца такім рэальным, што яна пачынае адчуваць да маладога караля сімпатыю. Гераіня даведваецца, што яна і ёсць нашчадак дзяўчыны са сна, і застаецца з гэтай праўдай сам-насам на ўроку гісторыі, з якога фактычна пачынаецца новы навучальны год. Звыклая, нецікавая гісторыя становіцца для маладой дзяўчыны

© Пятроўская Т. М., 2017



Рэпазіторый БарДУ

актуальнай, звязанай асабіста з ёй, яе сям'ёй. Сувязь кожнай асобы са сваім родам, адказнасць чалавека за мінулае і будучыню ненавязліва сцвярджаецца праз вопыт падлетка. Важна, што непасрэдным удзельнікам гістарычных падзей з'яўляецца ўсё ж гістарычная асоба, а Наста, прадстаўнік сучаснага пакалення, проста атрымлівае магчымасць назіраць за гэтымі падзеямі, містычна ўплываць на іх. Наяўнасць загадкі надае твору займальнасці: падлеткі разам спрабуюць вызначыць сэнс сноў Насці, тым самым раскрываючы тайну яе рода і рэальныя гістарычныя факты, якія наўрад ці зацікавілі б іх раней. Тыпова «падлеткавым» з'яўляецца і эмацыянальны фон твора, які выражаецца ў рамантычным прадчуванні першай вялікай закаханасці. Дарэчы, такое прадчуванне часцей за ўсё і становіцца аб'ектам увагі пісьменнікаў, якія працуюць у жанры падлеткавай прозы. Яно дае магчымасць не паглыбляцца ў будзённасць адносін паміж жанчынай і мужчынам, дастаткова рамантызаваць пачуццё першай закаханасці. Такі ракурс на тэму дае своеасаблівы маральны ўрок: само па сабе каханне з'яўляецца падарункам, якія б пакуты яно не несла. У творы прадчуванне кахання выражана толькі ў адным эпізодзе, калі ўдзячны Казімір за сваё выратаванне запрашае Насцю ў палац: «Настуся затрапятала, але не ад слоў. Яна раптам зразумела, што на яе цікаўна-прыязным позіркам пазірае вялікі князь Вялікага княства Літоўскага — шаснаццацігадовы Казімір. Кроў прыліла да яе твару, стала цяжка дыхаць, быццам нейкая сіла цiснула i цiснула на яе. Хацелася паварушыць плячыма, скінуць гэты цяжар…» [1, с. 78]. Сучасную Насцю прыцягвае менавіта гэты эпізод, яна яго «пракручвае» ў сваіх думках і марах, нягледзячы на тое, што гістарычныя факты суха паведамляюць пра тое, што жонкай Казіміра стала зусім не Настуся.

2. *Падлеткавыя дэтэктывы.* Трэба адзначыць, што падлеткавы дэтэктыў якасна адрозніваецца ад звычайнага дэтэктыва, бо апошні не абслугоўвае педагагічныя і выхаваўчыя задачы. Дзіцячы дэтэктыў — гэта ўсё ж штучнае вынаходніцтва, ён не мае вытокаў у дзіцячым фальклоры, як, напрыклад, містычныя фэнтэзі, жахі. Любы дэтэктыў грунтуецца на злачынстве, якое заўсёды мае дачыненне да дарослых. Гэта значыць, дзіцячы дэтэктыў — уцягванне дзіцяці ў рэаліі дарослага жыцця. Усе дарослыя ў ім выконваюць дзве функцыі: 1) маюць дачыненне да злачынства, 2) дапамагаюць даследаваць злачынства. Важна, што дзецям даецца права на самастойнае вырашэнне задачы, сапраўдныя выпрабаванні і прыгоды ў дарослым жыцці. Прыцягвае дэтэктыў падлеткаў і сваёй рэалістычнасцю. Калі ў фэнтэзі ствараецца прыдуманы свет, дзе ў канфлікце дабра са злом у якасці носьбітаў дабра выступаюць міфічныя, містычныя істоты, то ў падлеткавым дэтэктыве носьбітам дабра становяцца самі дзеці. Прадстаўніком аўтараў дзіцячага дэтэктыва ў класічным разуменні з'яўляецца Андрэй Федарэнка. Яго дэтэктывы з'яўляюцца займальнай літаратурай, разам з тым яны маюць моцную выхаваўчую дамінанту. Галоўная асаблівасць дэтэктыва як жанру — гэта яго кананізаванасць і стэрэатыпнасць. Нягледзячы на тое, што дзіцячы дэтэктыў і ўтрымлівае гэтыя рысы, важным для яго з'яўляецца ўсё ж наяўнасць прыгодаў, дынамічны характар твора. Для падлетка не так важна, каб загадка, злачынства адрозніваліся пэўнай арыгінальнасцю, галоўнае — максімальна ўдзельнічаць у вырашэнні «дарослай» праблемы, якая наўрад ці была б вырашальнай дзецьмі ў рэальным жыцці.

3. *Творы з актуальнай для падлетка праблематыкай.* Як правіла, асноўнай тэмай такіх твораў з'яўляюцца ўзаемаадносіны з супрацьлеглым полам, сяброўства і адносіны да бацькоў. Па сутнасці, гэта і ёсць праблемы, якія выносяцца падлеткамі на першы план. Амаль заўсёды герой у такіх творах перажывае канфлікт як з самім сабой, так і з людзьмі, якія знаходзяцца побач. Часта, ствараючы такія кнігі, аўтары звяртаюцца да ўласнага вопыту, таму творы носяць спавядальны характар. Гэта, безумоўна, скарачае дыстанцыю паміж дарослым аўтарам і падлеткам. Праблема ўзаемаадносін розных пакаленняў — адна з вядучых праблем не толькі саміх твораў, але і праблема напісання твора для дзяцей дадзенай узроставай катэгорыі. Да тэмы першага «дарослага» вопыту звяртаецца В. Гапееў у творы «Першы боль, або Доказ закона прыгажосці». Трэба адзначыць, што ўсе героі-падлеткі В. Гапеева — даволі дарослыя для свайго ўзросту: яны самастойна зарабляюць на жыццё і стала мысляць. Нягледзячы на гэта, аўтар апісвае непрадказальнасць і імгненнасць тых змен, што адбываюцца з падлеткам, калі ён пераходзіць у стан дарослага чалавека. Не выключэнне і шаснацаццігадовая Каця, якая па сямейных абставінах вымушана жыць на дачы і большую частку свайго часу займацца гаспадарчымі справамі. Але ніякія абставіны не здольны спыніць тыя змены, якія адбываюцца з гераіняй. Дастаткова дэталёва і разам з тым рамантычна-ўзнёсла апісвае аўтар першае дзявочае замілаванне ўласнай знешнасцю, якая сапраўды становіцца жаночай: «Улеглася хваляванне. Ужо апрануўшы бялізну, Кацярына зноў падышла да люстра, больш пільна агледзела свой твар. Ён быў роўна загарэлы, скура яшчэ і цяпер трохі ружавела ці то ад гарачай вады, ці то ад узбуджэння. Але галоўнае — не было бачна прышчыкаў. Толькі на ілбе яшчэ заставаліся крыху, але і яны, было бачна, сходзілі» [2, с. 112]. Змены ў знешнасці надаюць Кацярыне смеласці і ўпэўненасці не толькі ў марах. Яна актыўна дзейнічае па заваяванні ўвагі аб'екта свайго кахання — Юрыя. Мары дзяўчыны абмяжоўваюцца менавіта інтымнай блізкасцю з хлопцам. У падлеткавай свядомасці, затуманенай новымі зменамі ў знешнасці, фізіялагічнае каханне атаясамліваецца з духоўнай блізкасцю. Для дасягнення сваёй мары Кацярына складае план, прычым выконвае яго бездакорна правільна, як дарослая, вопытная жанчына. Аднак калі гераіня дасягае сваёй мэты, інтуітыўна пачынае разумець памылковасць сваіх уяўленняў пра адносіны паміж мужчынам і жанчынай. Сумненні пацвердзіліся ўжо праз некалькі хвілін, калі на тэлефон дзяўчыны прыйшло паведамленне: «Каця, мы — дарослыя людзі, мы атрымалі цудоўны ўрок. Не будзем пра пачуцці — галоўнае, усё выйшла чыстым.



Рэпазіторый БарДУ

На гэтым кропка» [2, с. 133]. Учынкі герояў, іх разважанні — даволі дарослыя, ды і апісаная сітуацыя не мела б такога важнага значэння, калі б не яе героямі з'яўляліся падлеткі. Для Кацярыны — гэта не проста сумная гісторыя кахання, а першы вопыт дарослага жыцця.

**Заключэнне.** На сучасным этапе падлеткавая літаратура пачынае развівацца больш інтэнсіўна, чым у папярэднія гады, аб чым сведчыць заснаванне дзвюх паўнавартасных серый, прызначаных для падлеткаў: «Пераходны ўзрост» (2008) і «Маладзік» (2012). Такім чынам, упершыню ў айчыннай літаратуры прызнаецца права падлетка на літаратуру для свайго ўзросту: замест абагульненай фармулёўкі «для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту», пад якой часта выдаюцца і творы для дарослых, з'явілася больш канкрэтная адрасацыя. Аднак сучасная беларуская падлеткавая проза — мала распрацаваны сегмент кніжнага рынку. Найбольш удала раскрываюць тэму падлеткавага жыцця так званыя праблемныя творы, якія ілюструюць канфлікт падлетка з акаляючым асяроддзем, першы вопыт дарослага жыцця.


**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Бадак, А.* Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца : аповесці / А. Бадак, Р. С. Баравікова, А. Наварыч. — Мінск : ЛіМ, 2008. — 175 с.
2. *Гапееў, В. М.* Урокі першага кахання : аповесці / В. Гапееў. — Мінск : ЛіМ, 2011. — 192 с.



УДК [821.161.1]–31.09



**Т. А. Рогот**

*Учреждение образования «Витебский государственный университет имени П. М. Машерова», Витебск*


## МОСКВА 1930-Х ГОДОВ В РОМАНЕ М. А. БУЛГАКОВА «МАСТЕР И МАРГАРИТА»

**Введение.** В данной статье раскрываются сатирические методы и приемы создания образа Москвы 1930-х годов в романе М. А. Булгакова «Мастер и Маргарита». Итоговое произведение писателя представляет собой мениппею — метажанр, совмещающий в себе полярные начала (философское и сатирическое, трагическое и фарсовое, фантастическое и реалистическое). В нашей работе мы обратимся к сатирической части романа, сосредоточенной в «московских» главах.

Цель статьи — выявить особенности булгаковской сатиры в изображении Москвы 1930-х годов.

**Основная часть.** Создавая сатирический образ Москвы 1930-х годов в романе «Мастер и Маргарита», М. А. Булгаков высмеивает разные виды пороков. Так, общечеловеческие пороки обличаются на примере обывателей Москвы. Пагубность профессиональных пороков писатель раскрывает посредством образов администрации и сотрудников театра Варьете, а также работников жилтоварищества. Массолит же представляет собой царство лжеискусства и деспотизма.

Исследователь И. И. Виноградов отмечает: «Да, это сатира — настоящая сатира, весёлая, дерзкая, забавная, но и куда более глубокая, куда более внутренне серьёзная, чем это может показаться на первый взгляд. Это сатира особого рода, не такая уж часто встречающаяся, — сатира нравственно-философская… Михаил Булгаков судит своих героев по самому строгому счёту — по счёту человеческой нравственности» [2, с. 76].

Объектом сатиры М. А. Булгакова становится не отдельный порок, а жизнь как целое, порочный мир с коллективной виной. Писатель рисует лица персонажей с полным отсутствием в них духовной устремленности. Булгакову важно показать в живой цельности характеров результат утраты человеческой полноценности. В облике каждого персонажа наблюдается несоответствие, противоречие, карикатурные черты вплоть до гротескной деформации.

Москвичи в романе — это ограниченные люди, не верящие ни во что, кроме материальных благ. В булгаковской Москве нет ни настоящей дружбы, ни истинного искусства, ни просто мудрых и честных людей. Система сатирических персонажей дает целую иерархию греховных пороков: ложь, мошенничество, лицемерие, самоуправство, заносчивость, насилие, пьянство, разврат, доносительство.

Одним из пороков, обнажающихся в романе, является «служебное несоответствие». Примером этого порока может в полной мере послужить администрация и сотрудники театра Варьете.

Со Степаном Богдановичем Лиходеевым — директором театра Варьете, а по совместительству бездельником, бабником и пьяницей, мы знакомимся в седьмой главе: «Вообще они в последнее время жутко свинячат. Пьянствуют, вступают в связи с женщинами, используя своё положение, ни черта не делают, да и делать ничего не могут, потому что ничего не смыслят в том, что им поручено» [1, с. 186].

Служебное несоответствие Лиходеева подчёркивается не только оценкой Коровьева, но и мнением о директоре его коллег — финдиректора Римского и администратора Варенухи:


© Рогот Т. А., 2017



Репозиторий БарГУ